# «Пярэднікжоўты, плашчыкрыжы…»

Сімвал года-2010 сяродптушакБеларусі — пустальга.

Пустальга (FalcotinnunculysLinnaeus (F. t. tinnunculus) — птушкасямействасакаліных.Даўжыняцела — каля 35 см, маса — да 275 г. Сустракаецца па ўсёйтэрыторыіБеларусі. Селіццаадзіночныміпарамі, рэдка — калоніямі да 10 пар, на сасне, елцы, дубе, вольсе, у старых і новых гнёздах варон, сарок, гракоў і іншыхптушак, дуплах.

Мінулым летам на дачы разам з суседзяміназіралі за цікавымвідовішчам: над намі «завісла» ў паветрыдзіўная птаха. Ловячыпаветраную хвалю, янашустратрапяталападобнымі на серп крыламі і трымаласяпарашутам на адныммесцы на вышыніметраў з пятнаццаць. Напачаткупадумалася, штогэта змей, запушчаны ў неба дзецьмі. Аднак — не, гэтаптушка, якуюспакойна і дзелавіта, як заўсёды, вызначылапажылаяЛіліяЛявонцьеўна, назваўшыяе «пустельгой».

Мы любавалісягэтайнечаканайгосцяйхвілінпяць! Пасляянакаменем упала на зямлю, схапілапісклявагамышака ў моцныякіпцюры і стрымгалоўадляцела ў бок суседнягапералеску. Што і казаць, на цэлыдзень у нас была толькігамонкапрапустальгудыяевізітна наша лецішча. Рэдкаяўсё ж такіпадзея…

Разгледзецьпустальгу ў такімпалёце — аднозадавальненне! Найпершпраафарбоўку — яна рыжа-бурая, скрозьчорныякрапінкі-рабацінне. Галававяртлявая, шызая, дарэчы, як і хвост-веер. Крылы, я ўжоказаў, серпападобныя, дзюбагарбатая, вострая. Вочыбусінычарнявыя, вялікія, зоркія. Бачнаадразу, пустальга — птушка-драпежнік, яна ж з роду сакаліных.

Арнітолагізаўважылі, штошулячокціаролак (так пустальгуяшчэназываюць у народзе), сустракаецца на ўсёйтэрыторыіБеларусі. Прылятаеяна да нас у сакавіку і, штоадметна, ніколісамастойнагняздо не будуе — адшуквае чужое, сёлетняецімінулагодняе, не важна, дзеяноразмешчана — у дупле або на дрэве. Патрабаванні ў пустальгі да сваёйдыслакацыііншыя, каб была вышыняметраўпад 10—15 для выдатнагаагляду, і ландшафт з адкрытыхпалёў, лугоў, выганаў, палянак, кустоўя з пусткамі, балотцамі — месцы, найбольшпрыдатныя для палявання. Тамугэтуюжвавуюптушкусустрэнеш не ў гушчары, а на ўзлеску, паблізувёскі, дач, на меліяраваных участках...

У гняздзе самка хуткаадкладвае 4—6 яек, якіянасіджвае на працягу 27—30 дзён. Гаспадаржадбайнаякорміцьдыпадбіраепры датныяўчасткі для таго, кабпасляхутчэйзадаволіць свой заўждыгалоднывывадак. Напачаткунасякомымі, затыммышамі, землярыйкамі, рыжыміпалёўкамі, яшчаркамі — асноўнымі ў ягоным меню.

Тут вартанагадаць, што слова «пустальга» ўжываецца ў нашаймове як абраза ў адносінах да чалавека, — у сэнселегкадумны, пусты, «пустадомак». Аднакніякайсувязі, акрамяназвы, з пустальгой-птушкай тут няма. Хутчэйнаадварот, з ёйможнапараўноўвацьнекага, як з сокалам — смелым, адважным, надзейнымваяром.

Ужо ў канцыжніўня-верасніпустальгаадлятае ў вырай, хоцьзаўважана, штонекаторыяасобінызастаюццазімаваць у нашайкраіне. НаогулжагэтадаволірэдкіВідптушак — недзеўсяго 1.700 пар налічваюцьвучоныя-арнітолагі ў нашайкраіне. Зразумела, пустальгазанесена ў ЧырвонуюкнігуБеларусі (1981 г.), тамуадстрэляецірразбурэннекладак не слаба караецца па законе.

Невыпадковаграмадскаяарганізацыя «АховаптушакБеларусі» вызначыласокала-пустальгуптушкай года-2010. У розны час, нагадаем, сімваламі года быліабвешчаныкнігаўка, верабей, ластаўка, барадатаякугакаўка (няясыць),

вялікаябелаячапля, шэрая гусь і інш. Іхусіх мы прадстаўлялі ў часопісе «Пралеска».

А зараз прапануем вершВіктара Гардзея, які так і называецца «Пустальга».

***Ляціць на пусткі з палясоўя,***
***Дзе мала дрэў і шматкустоўя.***
***Здалёкусё ж наўрадцільга***
***Пазнаць, штогэтапустальга.***
***Дывосьтрапеча шустра крыллем —***
***Завіснеўміг над чарнабыллем.***
***Асочвацьвыганы, лугі —***
***Такая звычка ў пустальгі.***
***Палёўкузгледзіцьпадсабою —***
***Унізкуляеццастралою.***
***Бацькіпалююць па чарзе —***
***Турботхапаепустальзе.***
***Звысокіхдрэўзаўважыць зорка,***
***Дземыш, дзесуслікава норка.***
***«Малых ціпракарміцьзмагу?» —***
***Пытаннемучыцьпустальгу.***
***Гнязда, між тым, не робіцьзроду:***
***Заняцьчужыямае моду.***
***Пейзаж паджнівеньскайсмугой —***
***Слуптэлеграфны з пустальгой.***
***Пярэднікжоўты, плашчыкрыжы,***
***Каптурыкшызы, позіркхіжы.***
***На чарнатропах, у лазе***
***Нялёгкавыжыцьпустальзе.***
***Таму і кружыцьпаўздаліны***
***Драпежнік з роду сакаліных.***



Пакажжадзецямгэтурадасць. ...І няхайхоць бы колькіянапарадуеіх!

***Алесь Пралескавіч***
**Источник:** Пралеска.-2010.-№ 3.-С. 63.